ПАДЗЕЯ

# З АСТРАВЕЧЧЫНЫ З ЛЮБОЎЮ

**27 красавіка 2023 года Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці прымаў чарговы этап краязнаўча-асветніцкага праекта Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі пад назвай «Літаратурны Рэгіён-фэст». Да гродзенскіх аматараў і знаўцаў прыгожага пісьменства завіталі госці з Астраўца, прадстаўнікі раённага літаратурнага аб'яднання «Астравецкай зямлі галасы».**



Кіраўніком творчай суполкі на працягу ўжо 8 гадоў з'яўляецца член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі, паэт, краязнаўца, публіцыст Аляксандр Марозаў *(на здымку).* Аляксандр Іванавіч трапіў у Беларусь са свайго роднага горада Дэбальцава (ДНР), ахопленага вайной. Пра гэта, а таксама пра ідэю і ход «ЛітРэгіёнФэста» прысутным у зале аматарам мастацтва, прадстаўнікам розных пакаленняў распавяла старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч *(на здымку).*

Нагадаем, што «Літаратурны Рэгіён-Фэст» быў ініцыяваны пісьменніцкай арганізацыяй Гродзеншчыны ў мінулым, 2022 годзе і не мае аналагаў у Беларусі. Мэта праекта – прадэманстраваць гродзенцам багатую палітру літаратурнага жыцця Прынёмання, якую складаюць дзеючыя ў розных кутках рэгіёна літаб'яднанні, падкрэсліць ідэю кансалідацыі творчай грамадскасці на прыкладзе мірнай і стваральнай працы літаратараў-рэгіяналаў. Пра тое, як у межах праекта адбываюцца спатканні з сучаснымі аўтарамі, можна даведацца з фотарэпартажаў на галоўнай старонцы афіцыйнага інтэрнэт-сайта ГрАА СПБ www.pisateli.by , а таксама з відэафільмаў у рубрыцы «Відэа» нашага сайта.



У сваю чаргу, Аляксандр Іванавіч Марозаў сардэчна павітаў гродзенскіх слухачоў, распавёў пра гісторыю літаб'яднання «Астравецкай зямлі галасы», якое дзейнічае пры Астравецкай раённай бібліятэцы. Больш падрабязна пра літаб'яднанне распавяла яго актывіст Людміла Іванаўна Кухарэвіч. Сёлета калектыў рыхтуецца адзначыць сваё 15-годдзе. Ля вытокаў творчай суполкі стаіць вядомы ў Беларусі журналіст, публіцыст, празаік, драматург, член СПБ Ніна Аляксееўна Рыбік (газета «Астравецкая праўда»). Другім кіраўніком літаб’яднання была Таісія Сямёнаўна Сямёнава. За гэтыя паўтара дзесяцігоддзя аб’яднанне вядучых літаратараў раёна стала згуртаваным калектывам сапраўдных сяброў-аднадумцаў, патрыётаў сваёй малой радзімы і нашай сінявокай Беларусі. Любоў да роднай зямлі з'яўляецца асноўным матывам у творчасці літаб'яднання з горада атамшчыкаў, якім з'яўляецца Астравец. Астравецкія аўтары пішуць вершы, прозу, публіцыстыку, краязнаўчыя артыкулы і нарысы, вельмі любяць складаць і выконваць песні, маюць публікацыі ў перыёдыцы.




У складзе Астравецкага раённага літаратурнага аб'яднання «Астравецкай зямлі галасы» на сённяшні дзень 14 аўтараў. На жаль, з-за вялікай адлегласці для выступлення на гродзенскай сцэне змаглі прыехаць толькі шэсць прадстаўнікоў калектыву. Гэта Ганна Іванаўна Чакур (абразкі, празаічныя мініяцюры); Капіталіна Цімафееўна Пятроўская (паэзія, песні, прыпеўкі); Святлана Васільеўна Еўтушэнка (абразкі, празаічныя мініяцюры); Людміла Іванаўна Кухарэвіч (паэтэса, аўтар і выканаўца песень); Ванда Аляксандраўна Радзевіч (вершы, песні) і зразумела, Аляксандр Іванавіч Марозаў (выступіў з чытаннем сваёй лірыкі).













Госці прывезлі з сабой цэлы стэнд са сваімі аўтарскімі выданнямі і публікацыямі. Прагучалі творы на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах. Астравецкія паэтэсы так любяць спяваць уласныя тэксты, што смела робяць гэта нават без акампанементу. Выступленні былі напоўнены шчырай любоўю да людзей, да жыцця, да нашай роднай зямелькі. Некаторыя з іх так завялі залу, што гледачы танцавалі ў праходах. Творчае знаёмства з дэлегацыяй літаратараў Астравеччыны нікога з прысутных не пакінула абыякавым. А што тычыцца мастацкага ўзроўню творчасці гасцей, усе яны гатовыя працаваць над сабой, удасканальвацца сумеснымі намаганнямі. У знак падзякі за творчасць і ўдзел у «Літаратурным Рэгіён-фэсце» гасцям з Астравеччыны быў уручаны дыплом Ганаровага партнёра Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Да новых сустрэч, «Астравецкай зямлі галасы»! Будзем рады пачуць вас зноў.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**
Фота **Анатоля Апанасевіча**




І лёг радок
на белы ліст паперы
Крылья
Грибы
Родник






І лёг радок
на белы ліст паперы
ДЫПЛОМ


І лёг радок
на белы ліст паперы